***Максім і Гаўрыла Гарэцкія: жыццё і творчасць (да 100-годдзя Першай і 75-годдзя Другой сусветных войнаў): матэрыялы XXII Гарэцкіх чытанняў / Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Рэспубліканскі фонд імя братоў Гарэцкіх, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі / адказны рэдактар Р. Гарэцкі. – Мінск: Выдавец В. Хурсік, 2014. – 196 с.***

Сучаснае гарэцказнаўства складана ўявіць без штогадовай канферэнцыі «Гарэцкія чытанні», па матэрыялах якой выдаецца зборнік артыкулаў, дзе разглядаюцца розныя аспекты жыццёвага, творчага і навуковага шляху братоў Гарэцкіх. Каштоўнасць выдання вынікае з таго, што ў ім друкуюцца рэвю навейшых кніг па тэме, падаецца інфармацыя пра дасягненні навукоўцаў, занятых распрацоўкай актуальных праблем галіны. Дзякуючы намаганням рэдакцыйнай калегіі, чытач атрымлівае магчымасць пазнаёміцца з мастацкімі творамі М. Гарэцкага, што ў свой час пабачылі свет малым тыражом, ці былі апублікаваны ў перыядычных выданнях, якія ператварыліся ў бібліяграфічную рэдкасць.

Матэрыялы XXII Гарэцкіх чытанняў вызначаюцца шэрагам канцэптуальных артыкулаў. Адзначым працу ***Р.Г. Гарэцкага*** (*«Гарэцкія ў гады першай (1914–1918) і другой (1939–1945) сусветных войнаў»*), заснаваную на ўнікальным біяграфічным матэрыяле і ўспамінах аўтара. У артыкуле *«Роздум пра заўтрашні дзень гарэцказнаўства»* ***М.І. Мушынскі*** адзначае дасягненні гэтага раздзела беларускага літаратуразнаўства і засяроджваецца на праблемах, што напаткалі яго ў апошні час. Даследчык прапануе ўнесці карэктывы ў існуючы фармат «Гарэцкіх чытанняў»: прысвяціць іх больш прыватнай тэме, запрасіць да супрацоўніцтва навукоўцаў, занятых у сумежных гуманітарных галінах. Складанай застаецца сітуацыя з новым Зборам твораў М. Гарэцкага і перакладам яго спадчыны на замежныя мовы. Паводле М.І. Мушынскага, тэма «Гарэцкі і тэатр» чакае дэталёвай распрацоўкі. Нягледзячы на пералічаныя негатыўныя аспекты, навукоўца станоўча характарызуе перспектывы гарэцказнаўства.

У святле выдання поўнага Збора твораў М. Гарэцкага актуальным падаецца артыкул ***Г.В. Кажамякіна*** *«Праблема захавання і даследавання творчай спадчыны Максіма Гарэцкага»*. Даследчык падкрэслівае, што рукапісы, машынапісы, выданні празаіка раскіданы па бібліятэках і архівах Беларусі (як дзяржаўных, так і прыватных). З цягам часу сітуацыя ўскладняецца, бо многія дакументы захаваліся ў адзінкавым варыянце, што патрабуе ашчаднага стаўлення да іх. Узнікае патрэба рэстаўрацыі і капіравання такіх унікальных адзінак захавання. Навукоўца прапануе стварыць асобны фонд, дзе б знаходзіліся самі арыгіналы і іх копіі.

Цікавасць даследчыкаў выклікае параўнальна-супастаўляльнае вывучэнне прозы М. Гарэцкага. Прыкладам можна лічыць артыкул ***Т.К. Грамадчанка*** *«Аповесці Максіма Гарэцкага "Дзве душы", "На імперыялістычнай вайне" ў кантэксце літаратуры прадстаўнікоў "страчанага пакалення"»*. Даследчыца разглядае паралелі, уласцівыя кнігам беларускага пісьменніка і Э.М. Рэмарка. Акрамя гэта, навукоўца вызначае некалькі кірункаў кампаратыўных даследаванняў: аповесці М. Гарэцкага і творы М. Шолахава, Б. Пастэрнака, супастаўленне спадчыны пісьменніка і іншых прадстаўнікоў беларускай літаратуры. У параўнальным рэчышчы вытрыманы артыкулы: ***Л.Я. Глазман*** (*«Трансфармацыя вобразаў юродзівага і жабрака ў апавяданнях М. Гарэцкага і Л. Андрэева»*); ***В.М. Губскай*** (*«Шлях беларуса ад ecce homo да homo soveticus (на прыкладзе твораў Максіма Гарэцкага, Васіля Быкава і Святланы Алексіевіч»*); ***А.Я. Ждановіч*** (*«Спецыфіка адлюстравання бессэнсоўнасці існавання ў беларускай прозе пачатку ХХ стагоддзя (па творах М. Гарэцкага, В. Ластоўскага, Ядвігіна Ш і інш.»*); ***А.Э. Сабуць*** (*«"Наперад ісці чалавеку гуманнаму": літаратурная рэцэпцыя М. Гарэцкага і А. Адамовіча ў творах пра вайну»*); ***В.Ф. Сяньковай*** (*«Рэпрэзентацыя самавызначэння асобы ў драматычных абразках Максіма Гарэцкага і драматургіі Гаральда Пінтара»*); ***В.І. Уткевіч*** (*«Тэма двайніцтва ў творах М. Гарэцкага і К. Гамсуна»*).

Зборнік вызначаецца тэматычнай разнастайнасцю: разглядаюцца дачыненне твораў М. Гарэцкага да хрысціянства (***З.У. Драздова***) і старажытнагрэчаскіх міфаў (***С.М. Тычына***), экзістэнцыялізму (***Т.М. Тарасава***), імпрэсіянізму (***Т.Б. Мацюхіна***), франтавыя лісты Л. Гарэцкага (***Н.Э. Шандроха***). Вылучаецца шэраг прац, прысвечаных мове твораў класіка, – артыкулы ***С.М. Запрудскага***, ***А.М. Лапцёнак***, ***В.В. Маршэўскай***, ***А.С. Садоўскай***.

Рэдактары матэрыялаў XXII Гарэцкіх чытанняў уключылі ў склад зборніка інфармацыю пра прэзентацыю кнігі ***Р.Г. Гарэцкага «Лісты жыцця і кахання»***, прысвечаную высокаму пачуццю яго бацькоў. Выданне ўключае ў сябе невялікую частку ліставання. Але матэрыял дазваляе меркаваць і пра асабістыя перажыванні, і пра балючы роздум пра Радзіму, пра лёс інтэлігента-беларуса.

Матэрыялы XXII Гарэцкіх чытанняў дазваляюць сфарміраваць уяўленне пра сучасны стан гарэцказнаўства, вылучыць актуальныя кірункі яго развіцця. Зборнік будзе цікавы шырокім навуковым колам, выкладчыкам беларускай літаратуры, студэнтам, усім, хто цікавіцца гісторыяй нашай краіны.

***З.І. Трацця*к, кандыдат філалагічных навук**

***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***